ПОЧТИЛИ ПАМЯТЬ ПОГИБШИХ

Населены пункт Бешанковічы, як вёска, вядомы з сярэдзіныXV ст. Пражыванне яўрэяў у мястэчку Бешанковічы дакументальна пацверджана з пачатку XVIII ст. У 1833 г. іх колькасць складала 47,2% жыхароў (518 чалавек), а ў 1897 г. яўрэяў было ўжо71,9% (3180 чалавек). Мовай зносін мясцовых яўрэяў, на ўсім працягу існавання грамады, была ідзіш. У 1912 годзе ў мястэчку прымала чытачоў яўрэйская бібліятэка Двосі Іёфе, было створана таварыства беспрацэнтнай пазыкі, якую узначальваў Берка Глікман. У 1919 г. ў Бешанковічах заснавана яўрэйскае пазыкова-ашчаднае таварыства. У дваццатыя гады XX ст. ў мястэчку працавалі 3 сінагогі, яўрэйская школа, дзіцячы садок, які атрымліваў дапамогу ад яўрэйскай дабрачыннай арганізацыі «Джойнт».У Бешанковічах нарадзіліся мастакі М. Б. Брукман, Г. Д. Глікман, С. Б. Юдовін, літаратар І. Д. Глікман, артыст В. Р. Гут, эканаміст Р. С. Фрадкін, паэт М. І. Юдовін. Пасля адмены мяжыаселасці ў 1917 г., многія яўрэі з'ехалі ў буйныя гарады, дзе было значна больш магчымасцей для працы і адукацыі. У 1939 годзе ў Бешанковічах засталося 1119 яўрэяў, што складала 26% насельніцтва гарадскога пасёлка. У ліпені 1941 г. Бешанковічы былі захопленыя гітлераўскімі войскамі. Гісторыя мясцовай яўрэйскай грамады трагічна абарвалася ў першы год нацыскай акупацыі, калі з ліпеня 1941 па люты 1942 гг. ў Бешанковіцкім раёне было знішчана 2900 яўрэяў. За 3 гады нямецкай акупацыі мястэчка было амаль поўнасцю разбурана. На месцы растрэла 11 лютага 1942 г. 1068 чалавек за Дзвіной, родныя і блізкія загінуўшых паставілі помнік з надпісамі на рускай мове і ідзіш.

Дакладна вядома, што яўрэйскія могілкі ў Бешанковічах ужо існавалі ў пачатку XIXст. Пасля знішчэння грамады ў 1942 г., яны перасталі дзейнічаць і паступова прыйшлі ў заняпад. Толькі эпізадычна, сіламі мясцовай адміністрацыі, тут рабіліся санітарныя высечкі. У чэрвені 2015 г. удзельнікі ініцыятыўнай групы з Санкт-Пецярбурга, Віцебска, Мінска, пры падтрымцы нашчадкаў жыхароў былога мястэчка, з розных краін, а таксама адміністрацыі вобласці і раёна, пачалі працу па дабраўпарадкаванні могілак. Іх плошча складае каля 4 га. Вынік працы 2015 г. – прыведзена ў парадак тэрыторыя каля 1 га. Самае старое пахаванне, знойдзенае летам 2015 г. датаванае 1837 г. Пахаванняў XVIII ст. пакуль не знойдзена. Апошнія сістэматычныя пахаванні адносяцца да 1940 г., пасля чаго яўрэяў хавалі на грамадзянскіх могілках гарадскога пасёлка. Ёсць некалькі пахаванняў, зробленых у 50 – 60 гг. XX ст. паадзінкавых дазволах мясцовай адміністацыі. Праца па ўзнаўленню могілак і памяці пра яўрэйскую грамаду былога мястэчка («штэтла») Бешанковічы будзе працягвацца.

Каардынаты ініцыятыўнай групы: beshmemorial@gmail.com

Ганна Клімовіч (РФ, Санкт-Пецярбург), aklimovit@gmail.com